# [2 верасня Міністр прыняў удзел ва ўрачыстай лінейцы, прымеркаванай да Дня ведаў, у сярэдняй школе №2 г. Бяроза]

Міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган 2 верасня наведаў сваю малую радзіму і прыняў удзел ва ўрачыстай лінейцы, прымеркаванай да Дня ведаў, у сярэдняй школе №2 г. Бяроза Брэсцкай вобласці, у якой ён вучыўся.

У гэты дзень у Рэспубліцы Беларусь першы школьны званок прагучаў для больш чым 115 тысяч дзетак. Усяго ў новым навучальным годзе будуць працаваць больш за 3 тысячы устаноў сярэдняй адукацыі.
Міністр павіншаваў прысутных на лінейцы школьнікаў і пажадаў ім паспяховай вучобы, а таксама стаць годнымі грамадзянамі нашай краіны, а па завяршэнні вучобы не забываць родную школу і вяртацца да сваіх вытокаў на сваю малую радзіму. Настаўнікам пажадаў цярпення, моцнага здароўя і творчага падыходу ў перадачы сваіх ведаў вучням.

Першаклашкам ўрачыста уручаны падарунак ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь - кніга «Беларусь - наша Радзіма».

Пасля ўрачыстай лінейкі школьнікі занялі свае парты і настаўнікі правялі першы ўрок пад назвай «Занімай, Беларусь маладая мая, свой пачэсны пасад між народамі!».

Сайт СШ №2 г.Бяроза: http://sch2.bereza.edu.by

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/02-09-2019-5186*